*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 13 (483) | Серада, 11 красавіка 1962 г. | Цана 1 кап.

# Камуністы універсітэта абмяркоўваюць матэрыялы сакавіцкага пленума ЦК КПСС

З ПАРТЫЙНАГА СХОДУ УНІВЕРСІТЭТА

З дакладам «Вынікі сакавіцкага пленума ЦК КПСС і задачы партыйнай арганізацыі універсітэта» на агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе выступіў міністр сельскай гаспадаркі БССР акадэмік **С. Г. Скарапанаў.**

Расказваючы аб рабоце пленума, дакладчык адзначыў, што велізарнае значэнне мае той факт, што ў дакументах пленума вызначаны роля і месца сельскай гаспадаркі ў стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, развенчана мёртвая схема траваполля і абаснавана неабходнасць укаранення больш інтэнсіўнай прапашной сістэмы земляробства, распрацаваны найбольш рацыянальныя формы і метады кіравання вытворчасцю, намечаны меры па далейшаму ўпарадкаванню матэрыяльна-тэхнічнага аснашчэння калгасаў і саўгасаў. Пленум вызначыў меры па выкананню жыццёва важнай і разам з тым, бадай, самай цяжкай часткі праграмы нашай партыі—развіцця сельскай гаспадаркі і стварэння ў краіне дастатковай колькасці зерня, мяса, малака і іншых прадуктаў, неабходных для поўнага задавальнення растучых патрэб народа.

За апошнія гады, працягвае дакладчык, наша партыя ажыццявіла ў сельскай гаспадарцы рад сапраўды рэвалюцыйных мерапрыемстваў, якія садзейнічалі значнаму павелічэнню сельскагаспадарчай вытворчасці. І гэта дало свае дадатковыя вынікі. Тым не менш наша партыя падвяргае рэзкай крытыцы палажэнне спраў у сельскай гаспадарцы.

Рост насельніцтва краіны, павелічэнне рэальнай заработнай платы працоўных павялічвае попыт на сельскагаспадарчыя прадукты. Між тым вытворчасць іх расце марудней, чым прадугледжана сямігадовым планам.

Асабліва рэзка гэта праяўляецца ва ўмовах Беларусі, за што рэспубліка зусім справядліва падвяргалася крытыцы.

Сакавіцкі пленум прааналізаваў прычыны адставання сельскай гаспадаркі і распрацаваў канкрэтную праграму, накіраваную на выкараненне маючыхся недахопаў.

Партыя падкрэслівае, што арганізацыя магутнага ўздыму сельскай гаспадаркі—адна з галоўных і неадкладных задач камуністычнага будаўніцтва, і ўсе магчымасці для яе паспяховага вырашэння ў нас маюцца.

Першым і найбольш істотным рэзервам з'яўляецца пераход на больш інтэнсіўнае выкарыстанне зямлі. Неабходна пашыраць пасяўныя плошчы, павышаць ураджай, павялічваць валавыя зборы, перш за ўсё, зерня. Гэта праблема нумар 1, ад паспяховага вырашэння якой у многім залежыць вырашэнне другіх праблем. Гэтаму значна перашкаджала паўсюднае ўкараненне травапольнай сістэмы земляробства, якая гістарычна выцякала з эканамічнай адсталасці царскай Расіі. Але цяпер іншы час, задачы іншыя, і зусім відавочна, што старымі метадамі іх вырашыць нельга.

Таму прэзідыум ЦК унёс на абмеркаванне пленума, а пленум аднадушна прыняў пастанову аб стварэнні калгасна-саўгасных ці саўгасна-калгасных тэрытарыяльных упраўленняў. Будуць створаны камітэты па кіраванню сельскай гаспадаркай у Саюзе, рэспубліках, краях і абласцях. Узмацніцца матэрыяльна-тэхнічная дапамога сельскай гаспадарцы.

Партарганізацыя універсітэта можа і павінна зрабіць многае, каб ператварыць у жыццё рашэнні сакавіцкага пленума.

БДУ—буйная навуковая установа рэспублікі, дзе працуе вялікі калектыў вучоных, прадстаўляючых розныя галіны навукі, прама ці ўскосна звязаныя з сельскагаспадарчай вытворчасцю.

Хімікі маглі б з вялікай карысцю для справы прыкласці свае намаганні да ўдасканальвання тэхналогіі вытворчасці і паляпшэння якасці штучных угнаенняў. Важна даць рэкамендацыі, як павялічыць ступень выкарыстання пажыўных угнаенняў у год іх унясення. Вельмі многае неабходна зрабіць у частцы вытворчасці хімічных сродкаў абароны раслін ад пустазелля і хвароб.

У сувязі з павелічэннем плошчаў пад пасевы кукурузы, цукровых буракоў перад біёлагамі паўстаюць новыя праблемы. Неабходна вырашыць пытанне забеспячэння калгасаў і саўгасаў такімі гатункамі і гібрыдамі кукурузы, якія пры нашых умовах давалі б высокія ўраджаі зялёнай масы і зерня. Задачы вялікія, і паспяховае іх вырашэнне—справа гонару вучоных і ўсяго калектыву універсітэта.

* * *

Выступіўшы ў спрэчках акадэмік **І. С. Лупіновіч** зазначыў, што ў сувязі з пераходам сельскай гаспадаркі на прапашную сістэму неабходна пераглядзець праграмы, стварыць новыя вучэбныя дапаможнікі. Сельскагаспадарчая вытворчасць з'яўляецца вельмі складанай і грунтуецца на дакладных навуках. Таму хімікі павінны працаваць сумесна з вучонымі іншых галін навукі. Добрыя вынікі дае, у прыватнасці, сумесная работа хімікаў з фізікамі.

Аб неабходнасці больш актыўнага ўдзелу студэнтаў у навукова-даследчай рабоце гаварыў **П. Г. Пятровіч.** Трэба выклікаць цікавасць у студэнтаў да пытанняў сельскай гаспадаркі. Аднак тут ёсць свае цяжкасці, у прыватнасці, у адносінах вучэбнай практыкі па жывёлагадоўлі і раслінаводству.

Дэкан геаграфічнага факультэта дацэнт **І. І. Трухан** зазначыў, што студэнты працуюць у глебавых атрадах, складаюць глебавыя карты для калгасаў і саўгасаў. Кафедры распрацоўваюць тэмы, звязаныя з пытаннямі сельскай гаспадаркі.

Аб неабходнасці рыхтаваць біёлагаў з сельскагаспадарчым ухілам, аб прывіцці студэнтам цікавасці да сельскай гаспадаркі гаварыў на сходзе рэктар універсітэта акадэмік **А. Н. Сеўчанка.**

З дакладаў і выступленняў выявілася, што многія недахопы ў пастаноўцы навукова-даследчай работы і падрыхтоўцы кадраў, адзначаныя на пленуме, маюць месца і ў БДУ. Так, пры вывучэнні некаторых дысцыплін—раслінаводства і глебазнаўства на біялагічным факультэце і асноў сельскагаспадарчай вытворчасці—асобныя раздзелы праграмы выкладаліся з уплывам травапольнай сістэмы, недастаткова праводзілася вучэбна-вытворчая практыка студэнтаў на вопытна-сельскагаспадарчых станцыях, у калгасах і саўгасах, тэмы курсавых і дыпломных работ студэнтаў не заўсёды былі звязаны з сельскагаспадарчай вытворчасцю.

У навукова-даследчай рабоце ўсё яшчэ мае месца недастатковая вытворчая накіраванасць некаторых тэм, кафедры не заўсёды здзяйсняюць сувязь тэорыі з практыкай сельскай гаспадаркі, мала практыкуецца комплексная распрацоўка важных праблем сумеснымі намаганнямі навуковых работнікаў кафедр біялагічнага, хімічнага, геаграфічнага і фізічнага факультэтаў, не праяўляецца патрэбнай заклапочанасці аб своечасовым укараненні ў вытворчасць вынікаў закончаных навуковых даследаванняў. Слаба пастаўлена шэфская работа, недастаткова папулярызуюцца сярод сельскага насельніцтва дасягненні сельскагаспадарчай навукі і перадавога вопыту.

* * *

Сход прыняў разгорнутую пастанову, накіраваную на значнае паляпшэнне работы ў гэтых напрамках.

**А. НІЧЫПАРУК.**

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

# Аб устанаўленні „Дня касманаўтыкі"

**У азнаменаванне першага ў свеце палёту савецкага чалавека ў космас Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанаўляе:**

**Устанавіць святкаванне «Дня касманаўтыкі».**

**«Дзень касманаўтыкі» адзначаць штогод 12 красавіка.**

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР**
**Л. БРЭЖНЕЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР**
**М. ГЕАРГАДЗЕ.**

Масква, Крэмль, 9 красавіка 1962 г.

# Па геафаку

У нядзелю будзе адзначацца Дзень свабоды Афрыкі. Студэнты чацвёртага курса геаграфічнага факультэта падрыхтавалі і правялі з выхаванцамі Мінскага музычнага дзіцячага дома № 8 цікавы вечар на тэму «Афрыка змагаецца».

* * *

Студэнты-пяцікурснікі геафака зрабілі ў мінулую пятніцу экскурсію на Салігорскі каліііны камбінат.

* * *

Таварыскую сустрэчу па баскетболу правяла зборная каманда геаграфічнага факультэта са спартсменамі навукова-даследчага інстытута глебазнаўства АН БССР у спартзале хімкорпуса. Цікавую гульню выйгралі госці з лікам 67:63.

**І. Ляскоўскі.**

# УНІВЕРСІТЭЦКІЯ НАВІНЫ

## *Аўтазаводскае дзякуй*

Струменіць з-пад колаў асфальт Маскоўскай шашы. Адзін за адным імчаць чатыры вялікія аўтобусы, перапоўненыя людзьмі. Ірвуцца на прастору задорныя, чароўныя гукі, і мелодыя змяняе мелодыю. Сама маладосць, сама радасць жыцця пасялілася на гэты раз у аўтобусы. На дварэ снег змешваецца з дажджом і мокрымі камякамі падае на асфальт, на прахожых, на дрэвы. Але ці ж гэта перашкода для энтузіястаў!

«Ты звени задорно, бубен,
Веселей играй, баян...».

І баян шчыра разлівае сваю вясёласць, дапамагаючы спевакам. Уладар яго, Мірон Бобер, не шкадуючы запалу, акампануе заўзятай кампаніі. А яна і сапраўды ж падабралася вясёлая! Гэта наша самадзейнасць выязджае з канцэртам на аўтазавод у Жодзіна.

Кіраўнікі самадзейных калектываў разам з праўленнем клуба універсітэта старанна папрацавалі над падборам рэпертуару канцэрта для рабочых.

Глядзельная зала дома культуры перапоўнена. З прывітальным словам ад студэнтаў універсітэта выступае Г. Герасіменка. Яму доўга апладыруюць аўгазаводцы. Затым пачынаецца вялікі канцэрт, які адкрываецца выступленнем аркестра народных інструментаў пад кіраўніцтвам М. А. Лісіцына. Аркестр выканаў фантазію на тэму рускай народнай песні «Карабейнікі», «Песню без слоў» Чайкоўскага, галоп з оперы Семянякі «Калючая ружа». Вялікім поспехам карысталася выступленне народнай харавой капэлы пад кіраўніцтвам А. Ф. Кавецкага. Удзельнікі яе праспявалі «Вясенні прызыў» Бетховена, латышскую народную песню «Вей, вей, ветрык», беларускую «Там, каля млына» і іншыя.

Танцавальны калектыў, якім кіруе Л. К. Алексютовіч, выканаў пяць народных танцаў і закончыў выступленне самадзейнага канцэрта малдаўскай танцавальнай сюітай. І, напэўна, найбольшая колькасць апладысментаў прыйшлася на долю выканаўцаў невялічкіх сцэнак Л. Пармона і Ледзенева. Выступілі на канцэрце і нашы салісты М. Гарбар, М. Мантураў і І. Валасацікаў.

Рабочыя засталіся вельмі задаволенымі выступленнем нашай самадзейнасці. Пасля канцэрта яны пажадалі студэнтам поспехаў у вучобе, перадалі нашым студэнтам і выкладчыкам гарачае рабочае прывітанне і выказалі вялікае жаданне часцей наладжваць такія сустрэчы.

—Вялікае дзякуй вам, сябры, за добры і вясёлы адпачынак,—закончыў сваё выступленне адзін з рабочых аўгамабільнага завода. І ў адказ яму ў зале раздаўся дружны выбух апладысментаў.

**М. ЗНАК.**

## *СЯБРОЎСКІЯ СУВЯЗІ*

*Працягваюць умацоўвацца і пашырацца дружалюбныя сувязі паміж студэнтамі універсітэта і студэнцкімі навуковымі таварыствамі ВНУ краіны. Гэтаму садзейнічае ўзаемны абмен дакладамі на студэнцкіх канферэнцыях, знаёмства з работай лабараторый і гурткоў.*

*Толькі ў мінулым годзе на XVIII студэнцкай навуковай канферэнцыі універсітэта быў заслуханы 41 даклад гасцей з ВНУ Кіева, Петразаводска, Масквы, Ленінграда, Львова, Вільнюса, Адэсы і іншых гарадоў.*

*Нашы студэнты рабілі даклады на 15 канферэнцыях і заўсёды атрымоўвалі высокія водгукі і ацэнкі сваіх паведамленняў.*

*Ужо ў першыя дні красавіка на студэнцкія навуковыя канферэнцыі камандзіравана 13 чалавек. У Адэскі універсітэт імя І. І. Мечнікава выязджалі з дакладамі Т. Сіняк (4 курс біяфака), В. Рагойша (4 курс філфака) і іншыя. У Тарту знаходзіцца дэлегацыя студэнтаў гуманітарных факультэтаў БДУ. Студэнт біяфака А. Стэльмах выступіць у Казані з дакладам, атрымаўшым 1 катэгорыю на рэспубліканскім аглядзе студэнцкіх навуковых работ.*

*Ужо разасланы запрашэнні студэнцкім навуковым таварыствам многіх ВНУ краіны для ўдзелу ў чарговай студэнцкай навуковай канферэнцыі нашага універсітэта.*

Э. РАДОЎСКІ.

## Ніл Гілевіч у гасцях у матэматыкаў

31 сакавіка ў госці да матэматыкаў-тэарэтыкаў 3 курса прыйшоў беларускі паэт Ніл Гілевіч. Ён пазнаёміў студэнтаў са сваімі вершамі, а пасля завязалася шчырая гутарка аб сучаснай беларускай літаратуры.

Гэтая сустрэча накіравала ўвагу студэнтаў на большую зацікаўленасць творамі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

Студэнты шчыра дзякавалі Нілу Гілевічу за яго вершы і гутарку.

**Па даручэнню курса**
**Л. ХОРАВА.**

## Наш Георгій Міхайлавіч

Калі размова ідзе пра тое, што інтэрнат па вуліцы Дзімітрава займае першае месца ў рэспубліцы і трэцяе—у Саюзе, то абавязкова ўпамінаецца імя каменданта інтэрната Георгія Міхайлавіча Рабцэвіча.



—Любіць наш Георгій Міхайлавіч парадак,—гавораць студэнты.—Тут нічога не скажаш.

Георгій Міхайлавіч патрабавальны не толькі да жыхароў інтэрната, але і да самога сябе. Ад самай раніцы, калі прачынаецца інтэрнат, да позняга вечара яго няцяжка знайсці. Ні адзін выпадак парушэння парадку не пройдзе міма яго: то інструктуе дзяжурных, то дае парады прыбіральшчыкам, то паказвае, як лепш заправіць пасцель. Ён жа былы старшыня Савецкай Арміі. І хоць шмат часу прайшло з той пары, як Георгій Міхайлавіч скончыў службу, аднак ён добра памятае салдацкі парадак.

— І ўсё ж там было лягчэй. Што ні кажы, а тут «асабовага саставу» у дзесяць разоў больш. Ды і «вайсковы статут» стражэй, чым студэнцкі,—жартуе Георгій Міхайлавіч.

Аднак любяць студэнты строгага і патрабавальнага, але добрага і клапатлівага Георгія Міхайлавіча Рабцэвіча.

**Р. МАРОЗ.**
**4 курс юрфака.**



На здымку (злева направа): студэнты вячэрняга аддзялення фізфака Белдзяржуніверсітэта А. Шыманскі з камвольнага камбіната, В. Ждановіч, супрацоўнік Белпрампраекта, і Э. Мейшутовіч, супрацоўнік Акадэміі Навук БССР рыхтуюцца да чарговых заняткаў.

Фота А. ЗАЙЦАВА.

## „Уваход са двара“

*Людзі ўваходзяць у дом праз дзверы, а не праз вокны. І нікому не прыходзіць думка ламаць гэтую старадаўнюю традыцыю. А вось студэнты, што жывуць у інтэрнаце па вуліцы Свярдлова, успамінаюць аб гэтым усякі раз, калі выходзяць з інтэрната ці вяртаюцца дамоў.*

*Невядома, за якія грахі караюць іх, але праз парадны ўваход, да якога вядзе выдатная асфальтаваная дарожка, нікога не пускаюць, нават на ключ зачынілі дзверы. Таму і даводзіцца студэнтам пераадольваць кожны раз «паласу перашкод» у выглядзе велізарных лужын, гразі, нават клумбы, якія шчыльна прыкрываюць падыходы да службовых дзвярэй.*

*А ўвечары тут сам чорт зламаў бы сабе шыю, хоць цемра для яго — самы зручны час. Добра, што хоць вокны свецяцца, а то прыйшлося б з «лятучай мышшу» хадзіць.*

*Шкада, што камендант інтэрната С. П. Ткачук рэдка бывае па вечарах у інтэрнаце. Інакш дайно б адчыніў галоўны ўваход.*

**В. Налімаў.**

# А гэта магло не здарыцца...

**Шумна запаўняецца 58 аўдыторыя. Студэнты хімічнага факультэта прыйшлі на камсамольскі сход. На павестцы дня адно пытанне: персанальная справа студэнта 4 курса Анатоля Пестрака. Адчуваецца, што сход будзе бурным. Пасля інфармацыі сакратара камітэта камсамола факультэта Герасімава на трыбуну ўзыходзіць юнак, нізка апусціўшы галаву.**

**— Так, я лічу сябе віноўным,— гаворыць ён.— У мяне не хапіла смеласці і прынцыповасці парваць з маральна разлажыўшайся групай Хадзеева. Я заслугоўваю суровага пакарання, але не лічу сябе чалавекам кончаным.**

**Анатолю задаюць мноства пытанняў. Таварышы цікавяцца, як ён трапіў у кампанію Хадзеева, што яго цягнула туды, якія ў Анатоля жыццёвыя ідэалы.**

**Аказалася, што Анатоль выпадкова пазнаёміўся з Хадзеевым яшчэ ў 9 класе і падтрымліваў з ім сувязь, як ён выразіўся, ад няма чаго рабіць. Збіраліся ў Хадзеева, гулялі ў бязглуздую гульню «лухта».**

**Адзін за адным выступаюць студэнты, аспіранты, выкладчыкі. Амаль усе выступаючыя абураюцца паводзінамі Анатоля.**

**— У здарыўшымся віноўны бацькі Анатоля,—сцвярджае першакурснік Ігнаценка.— Яго выхоўвалі ў цяплічных умовах, ён не ведаў цяжкасцей і не ведае, што такое праца.**

**Выступаюць студэнты Дарафеева, Конюшка, выкладчыкі Асташонак, Баркан, Рафальскі, аспіранты Салдатаў, Браніцкі, дэкан факультэта Цішчанка, сакратар камітэта камсамола універсітэта Малюковіч. Анатоль павінен быць выключан з камсамола і універсітэта — такі погляд выступаючых.**

**Студэнты Ласкоў і Макатун лічаць, што дастаткова суровай вымовы.**

**Большасцю галасоў Анатоль Пястрак выключаецца з радоў ВЛКСМ. Прымаецца рашэнне прасіць рэктарат аб выключэнні Пестрака з універсітэта на два гады...**

**У здарыўшымся, безумоўна, больш за ўсіх павінны сам Анатоль, яго бацькі. Але не меншая віна кладзецца на калектыў, у якім жыў Анатоль. На факультэце, вядома, маглі не ведаць аб сувязях Анатоля. Але як аб гэтым не ведаць у групе? Як можна сядзець з таварышам за адным сталом на працягу чатырох год і не ведаць, чым ён жыве, аб чым думае? Мае рацыю аспірант Браніцкі, які сказаў, што камсамольская арганізацыя хімфака не звяртае ўвагі на адасобленасць некаторых студэнтаў. Як бачыце, гэта часам вельмі дорага каштуе.**

**Д. ШОХАН,**
**член камітэта камсамола універсітэта.**

# У 510-й

Працяглы гучны званок. Доўгія калідоры галоўнага корпуса хутка апусцелі.

У аўдыторыі № 510 займаюцца студэнты першага курса гістарычнага факультэта. Адны з іх паглыбіліся ў канспекты, каб да прыходу выкладчыка яшчэ раз прагледзець пройдзены матэрыял, другія акружылі гістарычную карту, адшукваючы гарады, якія ахапіла паўстанне Балотнікава.

А вось і выкладчык гісторыі СССР, дэкан факультэта П. З. Савачкін.

Першым адказвае Віктар Кірэеў. Дакладна і упэўнена ён расказвае аб прычынах паўстання сялян пад кіраўніцтвам Івана Балотнікава. Адказам студэнта задаволены і яго таварышы, і выкладчык. Першая «пяцёрка». Добра падрыхтаваўся да семінарскіх заняткаў і Франц Варапковіч. Ён падрабязна расказаў аб ходзе паўстання, аб часовых поспехах і прычынах паражэння. Яго адказ ацэнен таксама выдатна.

Недастаткова падрыхтаваўся да заняткаў Вячаслаў Карпаў. Адказ яго быў няпоўны і блытаны. Незадаволеным застаўся выкладчык і адказам студэнткі Івашковай. Калі ёй было зададзена ўдакладняючае пытанне, яна зусім перастала адказваць.

У цэлым група пакінула добрае ўражанне. Студэнты па некалькі год працавалі на вытворчасці, многія дэмабілізаваліся з Савецкай Арміі. Хочацца верыць, што група здасць сесію добра.

*М. ЯКІМЧЫК.*

# За чысціню маральнага аблічча студэнта

Вось з чаго ўсё гэта пачалося. Студэнты чацвёртага курса фізфака В. Борзін, Л. Сальнікаў і А. Кільмановіч, добра выпіўшы з выпадку дня нараджэння Леаніда Сальнікава, выйшлі на вуліцу. П'яная кампанія, відавочна, вырашыла «пазабавіцца».

Яны сталі прыставаць да прахожых, лаяцца. Адны пужліва іх абыходзілі, другія спрабавалі напомніць падгуляўшым камсамольцам аб захаванні элементарных правіл прыстойнасці. Але дарэмна. Не ацвярэзіла іх і заўвага работніка міліцыі тав. Блінава. Наадварот. Борзін гэта выкарыстаў як повад «паказаць сябе», ён ударыў апошняга. Так, рашэнне пазабавіцца, пачатае ў інтэрнаце па вуліцы Бабруйскай, закончылася ў аддзяленні міліцыі. Борзін быў выключан з універсітэта. Пакараны і другія ўдзельнікі.

Гэта здарылася ў лютым. А ў сакавіку за хуліганства і псаванне маёмасці у новым корпусе выключан студэнт 5 курса гістарычнага факультэта А. Вінаградаў. Можна прывесці і яшчэ прыклады і факты. Іх, вядома, не многа, але справа не ў колькасці. Нават тыя, што тут прыведзены, застаўляюць сур'ёзна задумацца не толькі тых, хто жыў і вучыўся з гэтымі людзьмі, але кожнага студэнта і выкладчыка. Не, нельга заставацца раўнадушнымі да учынкаў борзіных, вінаградавых і да іх падобных, якія ігнаруюць агульнапрынятыя нормы і правілы паводзін, імкнучыся выдаваць сябе за «культурных» людзей.

У кожным учынку чалавека праяўляюцца яго духоўныя якасці. Учынкі даюць нам магчымасць убачыць часам за знешняй прыстойнасцю і паказной культурай сапраўдны твар чалавека, яго маральнае аблічча і сапраўдную культуру. Гэта мы бачым на прыкладах з Борзіным, Вінаградавым і іншымі. Тут нельга не ўспомніць словы М. І. Калініна: «Нахапацца розных ведаў, — гаварыў ён, — не такая ўжо хітрая справа. Набыць культуру — куды цяжэй».

Мы не ведаем, якія веды ў гэтых людзей, але, што датычыцца культуры, то яе проста не было, хоць яны вучыліся ў школе, займаліся ва універсітэце. Аб якой культуры можа ісці размова, калі выпускнік Вінаградаў псаваў мэблю ў новым вучэбным корпусе! Чаму можа навучыць гэты чалавек, калі ён сам робіць такія учынкі? Можна завучыць дзесяткі правіл, але па сутнасці заставацца бескультурным.

Уменне правільна паводзіць сябе павінна гарманічна спалучацца з усім духоўным абліччам чалавека, з яго высакароднымі намерамі. Сапраўдная культура крыецца менавіта ў маральным абліччы чалавека, у спалучэнні яго дадатных якасцей. Інтэлігентнасць вызначаецца не наяўнасцю дыплома, а шырынёй кругагляду і камуністычным светапоглядам.

Паводзіны, інтарэсы і запатрабаванні савецкага студэнта павінны знаходзіцца ў арганічным адзінстве з яго перадавымі перакананнямі, з яго светапоглядам. Аднак не ўсе разумеюць ці не хочуць разумець гэтага. Ці не аб гэтым гаворыць захапленне нізкапробнымі вершамі з боку студэнтаў 2 курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Арцем'евай, Бурдзіловіч і Буткевіча? Якраз аб гэтым. Ад дрэннага густу да дрэннага ўчынка — адзін крок. Таму нельга праходзіць міма падобных з'яў, не дапамагчы своечасова ўсведаміць свае памылкі.

Часам некаторыя здзіўляюцца, чаму ў нашым асяроддзі сустракаюцца такія студэнты, якія робяць дрэнныя ўчынкі. Для здзіўлення няма прычыны. Звычайна такія студэнты разлічваюць на беспакаранасць, карыстаюцца раўнадушшам, не заўсёды атрымоўваюць належны адпор. А паводзіны некаторых студэнтаў, падобных Борзіну, Вінаградаву і іншым, у многім залежыць ад патурання акружаючых. Горш таго, часам знаходзяцца нават спачуваючыя, якія не жадаюць умешвацца там, дзе гэта неабходна. Такі прынцып трэба адкінуць, бо ён шкодны для нас. Не хаваць дрэнныя учынкі, а прынцыпова ўскрываць іх, быць патрабавальнымі — вось што неабходна для нас.

Ведучы барацьбу за маральную чысціню і высокую культуру, за тое, каб маральны кодэкс будаўніка камунізма стаў законам жыцця, вызначаючым паводзіны кожнага савецкага чалавека, не трэба забывацца і аб скептыках, хлюпіках, якім на ўсё напляваць. Такія людзі, часам, ходзяць у «героях», бравіруюць сваім скептыцызмам, фарсяць завучанымі фразамі. Толькі неразуменне сур'ёзнасці гэтай з'явы студэнтамі, якім прыходзіцца сустракацца з такімі з'явамі, перашкаджае даць сапраўдную ацэнку, вызваць скептыкаў на адкрытую размову і выявіць іх унутраную нікчэмнасць, адсутнасць сур'ёзных ведаў.

Нас павінен цікавіць не толькі сам факт, з якім трэба змагацца, але і якія прычыны з'яўлення ў асобных студэнтаў такіх перакананняў і звычак, каб весці дзейсную прафілактыку. Вядома, адна з такіх прычын — гэта адсутнасць трывалых перакананняў.

Факты сведчаць аб тым, што ў нас далёка не ўсё ў парадку з выхаваннем студэнцтва. Відаць, не ўсе выхаваўчыя сродкі дасягаюць мэты, а мо' неабходна праверыць, ці адпавядаюць гэтыя сродкі ўзросшым запатрабаванням студэнтаў і патрабаванням самаго жыцця.

Абавязак кожнага студэнта — не толькі выконваць правілы паводзін, але і патрабаваць гэтага ад іх іншых. Своечасова спыніць чалавека, не даць яму аступіцца — гэта і ёсць барацьба за новага чалавека. І галоўнае — узняць у гэтай важнай справе ролю грамадскасці, каб ахапіць уплывам усіх студэнтаў, уцягнуць у кругаварот спраў кожнага юнака і дзяўчыну.

**Р. ЗІНІНА,**
**Г. ЮР'ЕЎ.**

# Гонар універсітэта

*Чалавеку, які ў першы раз заходзіць у заалагічны музей універсітэта, адразу здаецца, што ён трапіў у іншы мір, у царства жывёл і птушак. Вось ваўкі, медзвядзі, зубры, алені — яны быццам прытаіліся, убачыўшы цябе. А вакол стаіць таямнічая цішыня, паўзмрок і становіцца крыху боязна.*

*Заалагічны музей — краса і гонар не толькі біялагічнага факультэта, але і ўсяго універсітэта. Аб ім ведаюць ва ўсёй рэспубліцы. Сюды прыходзяць школьнікі, студэнты, дэлегацыі з розных краін. У кнізе ганаровых наведвальнікаў—подпісы кітайскіх студэнтаў, галандскіх дзяцей, дэлегацыі з Бельгіі... Ды ці пералічыш усіх!*

*Ва ўсім гэтым вялікая заслуга Антона Канстанцінавіча Цімошака, які аддаў музею 37 год свайго жыцця. Антон Канстанцінавіч сам хадзіў на паляванне, прасіў у знаёмых паляўнічых дастаўляць матэрыял, наладжваў абмен з зарубежнымі краінамі. Часам, працаваў да самага ранку, набіваў, апрацоўваў, майстраваў новыя экспанаты. Гэта дзякуючы яму заалагічны музей быў выратаваны ў час вайны. Антону Канстанцінавічу ўжо 69 год, але на пенсію ён яшчэ не збіраецца.*

*— Рана! — гаворыць ён.—Хачу бачыць свой музей вялікім, сапраўдным! Вось толькі развярнуцца нам няма дзе.*

*На самай справе, для музея адведзен адзін толькі пакой. Там цесна, нават прайсці цяжка. А колькі яшчэ экспанатаў ляжыць у майстэрні, бо няма куды дзець. Няўжо нельга знайсці яшчэ два—тры пакоі для музея, які ўжо даўно вырас з пакоя і калідора?*

**Я. КАЗЮКІН.**



На здымку: прафесар Дзмітрый Аляксеевіч Супруненка праводзіць кансультацыю са студэнтам-дыпламантам матэматычнага аддзялення завочнага факультэта У. І. Шапо.

Фота Э. ДАМАРАЦКАГА.

# Басни В. Жвалевского,

**студента 2 курса отделения журналистики**

## КОТ-АКТИВИСТ

*В артели «Крысомышзагот»*
*Работал мышеловом Кот.*
*Ему положено по штату*
*Сидеть ночами у норы*
*И ждать тихонько той поры,*
*Когда появятся мышата.*
*Работа скучная, нечиста.*
*А Кот был малый не дурак*
*И поступил он, братцы так:*
*Пробился срочно в активисты,*
*Вступил в кружок*
*«Пустые речи»,*
*Пролез в кошачий амбарком,*
*Мурлыкать в клубе стал потом.*
*А мыши бегают беспечно.*
*— Ловить их? Что вы? Это*
*вздор, —*
*Всем заявляет он спесиво.—*
*Неужто мне корпеть у нор?*
*А что же делать вам, пассиву?!*

*Я за активность, но не ту,*
*Что служит наруку Коту*
*И закрывает, словно щит,*
*Лентяя натуральный вид.*

## РАК

Хвалился рак,
Что он — моряк.
Он на клешнях носил татуировку,
Травил о шторме складно,
ловко...
Но, краба увидав морского,
На тему флотскую —
ни слова.

Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212, тэл. 2-07-19. *Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР.* АТ 09931. Зак. 904. Т. 2000. **Нам. рэдактара А. ВОЛК.**